Ба 44458
Ба 11614

Astapenka, Z.

Nr. 1354

Na uschod sonca.
Peršaja kniga veršau.
Mensk-1931 god.

Über Sonnenaufgang.
Erstes Buch der Gedichte.
Minsk-1931.

Wr. 1354

Б A 91

Зьмітрок Астапенка

Б 8
П 614

# на ўсход сонца

БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВА
1931

Ба 44458

ЗЬМІТРОК АСТАПЕНКА

1354

# НА ЎСХОД СОНЦА

*ПЕРШАЯ КНІГА ВЕРШАЎ*

Ба 44458

Дзяржаўная бібліятэка Беларусі

БССР Дзяржаўная бібліятэка імені Леніна

БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА
МЕНСК — 1931

Вокладка мастака Камінскага

25.04.2000

Заказ № 572. 2.000 экз. (VI) ($3^1/_4$ арк.). Галоўлітбел № 37.

Друкарня імя Сталіна.

## НА ЎСХОД СОНЦА

На ўсход сонца!
На ўсход сонца!

Узьнімайся, брат, радак мой,
Завалоданы віхурай
І захоплены імкненьнем
На ўсход сонца, на ўсход сонца...

З год раскіданага сьмецьця,
З учарайшага стагодзьдзя
Ўсьмешкай мёртваю сьмяецца
Спарахнелае мастацтва—

Колёнады пышных храмаў,
Сьцены гордае Эляды,
Чорных прывідаў гэрольды,
Чорны твар ілжывых масак...

Што было, што адзьвінела
Бяз тугі, бяз сьлёз, бяз сьледу,
Што закрэсьлена навекі
Год бязьлітаснай рукою—

Адыходзьце, адлятайце!

Хочу крочыць, хочу ймчацца
У вялікія стагодзьдзі,
Што нітуюцца ў аддалі—
На ўсход сонца, на ўсход сонца...

Пяруны адбушавалі,
Адгрымелі навальніцы.
З дзён разьбітых вырастае
Постаць гордая Комуны.

Чуеш?—мякка звоняць кельні.
Чуеш гулкі крык жалеза?
Кроў зямлі агнём пульсуе
І зямля расьце да сонца...

Хто шчасьлівы жыць сягоньня,
Хто кладзе муры стагодзьдзяў,
У каго, як сталь, цяглiцы
І палёт надхмарны думак—

Панапружвайце цяглiцы!
Напружыньце ўзьлёты думак!
З новай песьняй—нашай песьняй
Узьнімайцеся, ідзеце—

На ўсход сонца!
На ўсход сонца!

*КРАЇНЕ*

*

Агнямі і кроўю сардэчных поэм,
Ваганьнем артэрый няспынным
Мы славу, вялікую славу пяем,
Табе, дарагая краіна!

Хай кожнае слова і кожны уздых
Зьвініць галасамі баянаў
У далях балотаў і багнаў сівых,
У проймах бялёсых туманаў!

Няхай у суровыя высі тваё,
Пад згукі шырокага раньня,
Бунтоўная праца штандар узьвіе,
Чырвоны штандар будаваньня!

На сінім балоце, дзе багна і мох,
Дзе бросьня і водар багунны,
Няхай пракладзецца у будучнасьць мост
Пад рэйкамі гулкай чыгункі.

Няхай праімчыцца гарачы цягнік,
З эпохі крыві і нягодаў.
І рушыць сабою уздымныя дні
Вялікіх гадоў і стагодзьдзяў.

Агнямі і кроўю чырвоных поэм,
Сталёвай хадой індустрыі
Мы славу, вялікую славу пяем
Табе, дарагая краіна!

1928 г.

## З ПОЭМЫ „ВЯСНА ЗЯМЛІ“

### 1. НАПЕВЫ ВЯСНЫ

Сягоньня так блізка, знаёма
Пачуў я напевы вясны.
Сягоньня я з ціхага дому
У далеч вакно адчыніў.

Вакол лістападныя клёны
І сьветлыя лоні далін...
І думкі ў вясёлай пагоні
Лятуць у прасторы зямлі.

Я бачу – вясны агнявеі
Імчацца ў жытнёвы абшар,
Хаця... лістападам чарнее
Хлусьлівы, стары каляндар.

Ён штосьці гаворыць пра восень,
Пра жоўтых лістоў перазвон
І дальнія песьні прыносіць
Балотных гасьцей—журавоў...

Раней, у далёкія годы,
Як ён з лістападам вітаў—
Я ў гукі юнацкіх мэлёдый
Асеньнія песьні ўплятаў.

Былі у тых песьнях—дарогі,
Сузор'і асеньніх акрас
І іншага многа пустога
І любага кожнаму з нас.

А сёньня на жоўтую восень
Я з іншаю песьняй зірнуў...
У гэтай-жа восені штосьці
Я чую другую вясну.

Я рады ў агні загарацца
Вясновай пары залатой—
І песьні асеньняе працы
Зьліваюцца з песьняй маёй.

...Нястройна гучаць малатаркі,
Ля гумнаў шуміць паравік,
І клёны барвуюцца ярка
У мяцеліцы каласавін.

Даносіцца веялак рокат,
Саломы калышыцца бель.
За ціхім вакном, недалёка
Сартуе пшаніцу арцель.

Абозы колгасныя з хлебам
У горад ідуць чарадой...
І вісьне асеньняе неба
Над шыр'ю зямлі залатой.

### 2. ЗАДУМАЙСЯ, ДРУЖА...

Задумайся, дружа, якая краса
У трактарных гэтых колёнах,
Што з гораду йшлі каля ціхіх прысад,
Мінаючы сьвётлыя клёны!..

Якая магутнасьць! Які-жа размах
І сымболь прыгожы на дзіва!..—
Сталёвыя коні нам горад прыслаў
На плодныя нашыя нівы.

Я горад затое так моцна люблю,
Што гэтыя шумныя госьці
Прынесьлі з сабою вясну на зямлю,
Вясну ў урадлівую восень.

Прыслухайся, дружа, як ў сінюю муць,
У раньняй расе і тумане,
Сталёвыя госьці па полі плывуць,—
Упоперак межы ламаюць.

Як глуха трашчыць застарэлы быльнёг
На жорсткім адвечным узьмежку,
Як буйнае сонца з вясёлым агнём
Сталёвыя плавіць усьмешкі.

Я бачыў на вёсцы, што сотню гадоў
Стаяла нязрушна, задумна,
Ламалі павецi памершых дзядоў,
Будуючы веліч комуны.

Ĭ тут, на аселішчы продкаў сваіх,
Як сымболь пракляты старога,
Кідалі назаўжды у цьвіль абразы
Ля брудных зламаных парогаў.

Задумайся, дружа, як нашi палі
З вясноваю буйнаю стромай
Гісторыю пішуць жытнёвай зямлі,
Пракінуўшы сотні старонак!..

### 3. У ХОДЗЕ ШТОДЗЕННЫМ

Часы буянасьці прайшлі
Ĭ ў ходзе канулі штодзенным...
Нас нашы песьні прывялі
Да працы творчай і натхненнай.

З заводаў, жнівеньскіх лагчын—
Шырокай, сьмелаю лавінай
Пайшлі мы дружна ў далячынь
Ĭ павялі сваю краіну.

Ĭ вось цяпер,
За крокам крок,
У даль магутна і няспынна
Ідзе з малінавай зарой
Мая вясновая краіна.

Я чую грукат малаткоў
І сьпеў жалеза на заводзе...
Сталёвы плуг, сталёвы конь
Барозны новыя праводзіць.

Ён кліча новую зару
На даляў сьветлыя павекі.
Гадоў вялікіх буйны зрух
Перараджае чалавека.

І на палях, дзе ветраў стынь
Мяце асеньнюю дарогу,
На межах зьбітых колектыў
Удалеч трубіць перамогу.

Зямля цьвіце. Растуць рады,
Растуць юнацкія атрады.
Пад іхны поступ маладызы
Квітнее край вялікім садам.

Часы буянасьці прайшлі
І ў ходзе канулі штодзенным.
Нас нашы песьнь прывялі
Да працы творчай і натхненнай.

## 4. ЖЫЦЬЦЁ ІНАКШАЕ

Па вечарох зьвіняць лады
Пра шчасьце песень веснавое,
І як будуе колектыў
Жыцьцё інакшае, другое.

Як адчыніў чырвоны май
У разьлёт гадоў тугія дзьверы,
Як у комуне ураджай
Прыняў нябачныя памеры.

І песьні слухаюць дзяды
Ля новых ліпавых павецяў,
Успамінаючы гады
Мінулай цемры, ліхалецьцяў.

Шумяць яны і за гару
Гаворка сьцелецца спавівам...
І на вішнёвую зару
Глядзяцца росевыя нівы.

Зыходзіць вечар.
На зямлю
Спадаюць ліпеньскія росы.
Гарыць агнямі новы клюб.
У зорках сінія нябёсы.

Зямля цьвіце праз ціхі сон
Жытнёвым шчасьцем урадлівым.
І ніжуць ласкавы трызвон
Аўсоў зялёныя спавівы.

## 5. ІДУ

Іду да хаты ў вечар цёмны.
Вакол жыты... вакол жыты.
У плячох — ад працы слодыч стомы,
Іду, вакол жыты... жыты...

Халодна-цёмнае калосьсе
У твар мне пыршча кроплі-росы
І звоняць сонныя лады
Аб шчасьці вечна-маладым.

Іду. З нябёс глядзіцца месяц.
Ў прасторы—ноч і ціхі сон.
Палынны водар нікне дзесьці
У моры срэбраных аўсоў.

Пшаніца сонна хіліць пасмы,
Ў расе бульбовыя кусты.
Іду стамлёны да колгасу,
Вакол жыты. Вакол жыты.

Кастрычнік 1929 г.
г. Мсьціслаў.

## НА ПАЛЁХ

Дзе гоні сінеюць, дзе шэпчуць бары,
Дзе сьцежкі у восенскім пыле—
Трыццатыя суткі шумяць цесьляры
І зьмеямі шархаюць пілы.

Капаюць упарта няворaны дол,
Чарнобыль адвеку нязрушны,
Апілкі імчацца бялявым дажджом
І сьвішчуць вясёлыя стружкі.

Бярвеньне сасновае точыць смалу
І ў сьцены кладзецца адразу,
І лашчаць, і песьцяць глухую пілу
Сасновыя сьцены колгасу.

Ня стоміць сякера рукі цесьляру!..
Разносіцца гоман наўкола.
І сьцены ўзрастаюць памалу ўгару
З гатоваю шыльдаю „школа“.

І мала-па-малу кладуцца рады,
Растуць за ізрубамі йзрубы,
Каб новыя песьні й другія гады
У іх абвянчаліся шлюбам.

*

Эх, цесьляры!
Мацней! Мацней!
Плывем, сябры,
У далёкі рэйс.

Плывем, пайшлі
Ў далёкі рэйс,
Вясну зямлі
Ў палёх сустрэць.

Зірні, мой друг,—
Які прастор...
Стагодзьдзяў зрух
Прарочаць шторм.

Эх, цесьляры!
Вясёлы стук...
Працуй, сябры!..
Працуй!..

*

І новы колгас на прасторы прышоў
Цьвісьці, будаваць і змагацца
На славу вячыстую сьветлых гадоў,
Пад песьні вясковае працы.

Адны рэзолюцыі кінулі сьлед
(Ўрачыстасьць ішла адчыненьня)—
„Вядзі нас, компартыя наша, далей
Да новых шляхоў „дасягненьнеў"...



Ба 85444
БССР Дзяржаўная бібліятэка імені Леніна

Агнямі гарэў разуквечаны клюб
І сэрцы агнямі гарэлі...
Агнямі вачэй веснавую зямлю
Ў колгасе „Чырвоным“ сустрэлі.

Вясновыя песьні вясновых ладоў
Ўпрыгожвала лісьцямі восень,
І нібы дзесяткі мінулых гадоў
Зьняліся з плячэй гарацешных дзядоў,
Пад говар і сьмех маладосьці.

І доўга цягнуўся вясёлы банкет,
Якога ня чулі разлогі,
Якога ня бачыў ніякі поэт
Ніякай эпохі...

. . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Дзе гоні сінеюць, дзе шэпчуць бары,
Дзе вецер вясёлы, нястрымны,
Пад сонцам, што вечна над краем гарыць,
Цьвіце залатая радзіма.

Бясконца праходзяць—мінаюць гады,
Мінаюць бясконца стагодзьдзі...
Пад іхны палёт, як юнак малады,
Яна на прасторы выходзіць.

Яе апявалі дзяды-гусьляры
(Міналі—віліся дарогі),
А хто апяе гэты росквіт зямлі
І новыя сьмелыя крокі?

Гады за гадамі, як гучная сталь,
Зьвіняць і праходзяць нястрымна...
Расьце ў будаваньні і крочыць у даль
Мая залатая радзіма.

1929 г.

## ЖНІВО

Дзе ад раніцы вісеў туман
І гайдаўся вецер зухаваты—
Заглядзеўся ў неба, задрамаў
Аржаны асілак—элеватар.

Заглядзеўся на далёкі шлях,
А за шляхам, дзе прастор мігціцца,
Спачывае чорная зямля
Пад снапамі цяжкае пшаніцы.

Сёньня рана з сонейкам туды
Грамадой вясёлай, нязвычайнай
Паплылі, пастаўшы у рады,
Жнейкі і нязграбныя комбайны.

Пад нябёс гарачай сінявой
Жыта захісталася ў даліне...
— Пачынай савецкае жніво
На пpacтopax палявых, машына!

Паглядзі—на залатых палёх,
Галавой падпёршы чару неба,
Элеватары сумуюць па руччох
Чыстых зерняў залатога хлеба!

Пад радзімай нашай сінявой,
На палёх шырокай Украіны—
Пачынай савецкае жніво
На прасторах палявых, машына!

Хмаркі, стаўшы ў белыя рады,
Паплылі над полем ураджайным.
Сёньня рана з сонейкам туды
Адышлі жняяркі і комбайны...

Сьвеціць сонца. Сьпека. Зьнік туман.
Шэпча вецер лёгкі, зухаваты...
Заглядзеўся ў неба, задрамаў
Аржаны асілак элеватар.

1929 г.

* * *

Ґаварылі звонкія цапы,
Заклікалі восень на даліны...
На таку мякінны, гостры пыл,
Ля асеці груд каласавіны.

А насупраць новае гумно
З гучнаю арцельнай малатаркай.
Восень цэдзіць бурае віно
На лісты расквечаныя ярка.

На узьлесьсі шастаюць лісты,
А лясы, як птушкі, затужылі.
На загоне грэчкавым, пустым
Журавы махаюць белым крыльлем...

Восень ходзіць, кідае лісты
Ды бярэ ў балоце журавіны,
А як пройдзе—шастаюць лісты
І зьлятаюць з дрэваў на даліны.

Гэткі добры, гэткі любы час,
Хоць і сум агортвае паволі,
Малатаркі звоняць раз-у-раз,
— Ла-та-та! Разносіцца па полі.

Гаварылі гумны на зары,
Заклікалі восень на даліны,
Вось і восень ў золаце гарыць
І кідае лісьце ў каляіны.

— Ла-та-та!—Заходзяцца цапы...
— Ла-та-та!—Імкнецца дрыгацеьне,
На таку мякіны гостры пыл,
Лёгкі пыл апаў на прыгуменьні.

1929 г.
Мсьціслаўль

## ЗВАРОТ ПАРТЫЗАНАУ

Ой, на полі звон капытны,
Рэха ронячы, імкнецца.
На дарожаньцы прыбітай
Пыл стаіць, не расплывецца.

Ня сумуй, лясок лагодны,
Разуквецьцеся, паляны!..
Едуць з песьняю паходнай
Роднай вёскі партызаны.

Мкнуцца-рвуцца у блакітах
Стогны-звоны песьні трубнай,
А наперадзе—Мікіта
Любы, родны, русакудры.

Станьце, станьце, партызаны,
Злазьце з сёдлаў, злазьце з коняй!..
Звонкім сьвістам увабраны
Зазьвінелі вокал гоні.

Зазьвінелі, засьвісталі,
Засьмяяўся ясень статны.
Коні жаркія пасталі
Каля кожнай роднай хаты.

І сышоў з каня Мікіта,
Прытуліў к сабе Мар'яну.
Ой, шырокая ракіта,
Больш ня будзеш ты заспанай!..

— Не паеду, не пакіну
Цябе, люба, больш ніколі...
Заміраюць гукі, гінуць
У далёкім росным полі.

Ды быльнёг сухі зашастаў
У сініх песьнях недапетых—
Не загіне болей шчасьце
Ў залатых палёх саветаў!..

1927 г.
Мсьціслаўль

## ЗА МНОЮ ДАЛЁЧЫ ПАЛЁЎ

За мною далёчы палёў,
За мною шыр колгасаў...
Напевы шахтаў і станкоў
Мне чуюцца з Донбасу.

Цягнік ізноў імчыць угрунь,
Дае гудкі няспынна.
Бывай, уздым фабрычных труб
Рабочай Украіны!

Ў тваім прыбоі гарадоў,
Ў маторным дрыгаценьні
Я песьню новую знайшоў
І новых мар адценьні.

Ледзь толькі месяц у дазор
Між зорак паблукае,—
Здаецца мне, што я шахцёр,
З лапатаю і кайлам.

Чакаю сонца і гудка,
Чакаю раньні золак,
І цісьне моцная рука
Мой цяжкі верны молат.

Кідаю позірк за гару,
За купіны старыя...
Ўстае асілкам Беларусь
У шлеме індустрыі.

... За мною далечы палёў
І чорны дым Донбасу...
Цягнік імчыць мяне ізноў,
Віюцца рэйкі пасам.

1929 г.
Курск

## ЦЯГНІКІ АДГРЫМЕЛІ

Цягнікі адгрымелі і змоўклі ў далі,
Адсінелі ля станцый лагчыны...
І ад станцыі той без канца паплылі
Залатыя палі Украіны.

За вагонамі стэпы й нябёсы удвох
Запляліся ў ружовых праменьнях.
Дагарэла зара у бяскрайніх стэпох,
Папаўзьлі бесканцовыя сьцені...

Я сачыў праз вакно, як міналі палі,
Пад сьпяшаньне і гул паравозу,
Покуль раптам ўзьнялася ў шырокай далі
Гарадоў неабсяжная просінь.

Задыміла труба, загудзелі гудкі,
І няма—ні палёў, ні лагчынаў...
Прывітаньне напеву станкоў гарадзкіх,
Завадзкая мая Украіна!

Вось яны ў карпусах бесканцова гудуць,
Адгукаюцца лязгамі сталі...
На вячэрнюю зьмену рабочыя йдуць,
Прамінаючы гоман вагзалу.

Па кварталах разносіцца гоман і сьмех.
На кашулях—і вапна, і цэмант...
Закацілася сонца на ціхі начлег,
Заружовіўшы струны антэнаў.

Добры вечар, краіна дымоў і станкоў!
Ночка сьцеле шырокія пасмы
З-за бяскрайніх стэпоў, з-за глухіх хутароў
Да заводаў і шахтаў Донбасу...

Ля вагзалу шумяць, не змаўкаюць станкі,
Недзе стэпы заснулі у сіні...
Добры вечар, машыны, гудкі
Завадзкое мае Украіны!..

1929 г.
Харкаў

## БІБЛІОТЭКА

Часта ўвечары змрокам сінім,
Змрокам сінім, харошым адвеку,
Я заходжу сюды на хвіліну,—
Ў гэту ціхую бібліотэку.

З цёмкых шафаў, з паліц высокіх
Сустракае шумам паперы
Ціхі шэлест—як лёгкія крокі,
Лёгкі шолах у пыле шэрым.

Мабыць бегаюць недзе мышы—
Бяз прытулку і бяз прыстаньня.
Сонны пыл асыпае ціша
Па старажытных выданьнях

І вось іду я ў маўклівай стыні—
Пакой няпалены зранку...
Горад змоўк і недзе загінуў
За апушчанай пыльнай фіранкай.

Горад сьціх за шыбаю сіняй
І—недзе далёка яго разьбег...
І вось, па балонках ідуць краіны
У віхурах, у барацьбе...

Спачатку мглеюць бязьлюдныя эры
У б-цітом най Гісторыі Зямлі
Плезіозаўры, дапатопныя зьверы
Калышуцца ў Мэзозойскай далі.

Потым першабытныя людзі прасекі
Кладуць па эрах рыб і зьвяроў.
І ўрэшце, эгіпцяніна-чалавека
На будаваньні пірамід я знайшоў.

Я крыкнуў яму ў хваляваньні:
Што сказаў-бы ты, інжынэр,
Прышоўшы на вялікае будаваньне
У краіне Эсэсэсэр!..

Але рушыліся піраміды,
І ўстаў паміж дзікіх краін,
Крывёю глядыятараў абмыты—
Патрыцыянскі шумлівы Рым.

І кароткім мячом змаганьня,
На тарч прыняўшы варожы стан,
Сьцяг акрываўлены паўстаньня
Узьняў над Рымам Спартак.

Потым плямай сярэднявякоўя,
Пад званоў набажэнства гуд,
Выплыў, азначаны цемрай і кроўю,
Інквізытараў суд...

І здалося—у сутане нахабнай,
З клумкам індульгенцыйных папер,
У царкве Ватыкану рымскі папа
Служыць малебен супроць СССР.

І на „няверных“ з чорнасутанцамі
Ладзіць гэткі-ж агідны паход...
... Комкаючы балонкі, загарэўся семнаццаты
Героічны і блізкі год.

Край гарэў, захліпаўся крывёю,
Ўставалі —
Расія, Беларусь, Украіна, Сібір...
І сотні іншых пад штандарам боек,
Пад штандарам барацьбы...

І йшлі балонкі крыві і змаганьня,
Стагодзьдзі перакульваў год.
І йшлі балонкі—за паўстаньнем паўстаньне
І за паходам паход.

А потым—чырвань сьцягоў лілася
У прасторах вольных дарог.
Гэта віталі сьветлае шчасьце,
Здабытае крывёй перамог.

І вось калі будаваньня водгук
Загучэў, пад індустрыі крок,—
Узьвіўся раптам недзе за вокнамі,
Разрываючы цішу, гудок...

Гоман ішоў і ўзрастаў за вокнамі,
Ішлі натоўпы на вуліцы ўздоўж...
І за імі цьвёрдымі крокамі
Я пашоў сярод шумных радоў.

Ішлі натоўпы разьмерана, горда,
Нібы зноў у героічны паход.
... Гэта адкрывалі ў нашым горадзе
Новы завод.

7-IV 1930
Менск

## З ПЕСЕНЬ ПРА МУЛЯРОЎ

### 1

Спакойна, з гутаркай звычайнай
Пад чырвань ліпеньскай зары,
На сьцены, выстыглыя занач,
Па сходках лезьлі муляры.

Быў вецер поўны сноў і ласкі...
І вось пад імі (з вышыні)
Грымучы горад разаслаўся
І запаліў вітрын агні.

Як пчолы, лёталі трамваі,
За горад беглі цягнікі.
У небе хмары выплывалі
Чаўнамі зыбкае ракі.

Ішла хадой няспыннай праца
Пад стукат кельні і цаглін...
А ўнізе горад разаслаўся
І запаліў агні вітрын.

2

Купаецца цёплае сонца
Над вечна магутнай зямлёй,
І льлецца на сьцены бясконца
Пад ветраў ласкавы прыбой.

Стаяць муляры на узвышшы...
Ўгару рыштаваньні растуць.
І вежы, сьпяваючы зычна,
Да вольнага сонца кладуць.

А цэгла маўчыць і бялее
І сохне на сонцы цэмэнт.
І з цэглай ўзрастаюць надзеі
На вышках узьведзеных сьцен.

Ўсё вышай і вышай і вышай
Прыбой сакавіты вятроў.
Ўсё вышай і вышай і вышай
Пад сонечны сьлеў муляроў.

Красавік, 1930 г.
Менск

## УЗЬНІМАЮЦЦА РЫШТАВАНЬНІ

Узьнімаліся рыштаваньні
Цытадэльлю ад буйных бур...
Хто міне, а хто раптам стане
І глядзіць на высокі мур.

Мур высокі і весела цэгла
У муляровых руках зьвініць...
Хутка будуць тут сьцены цэхаў
І заводзкіх акон агні.

Кельня ляскае бранзалеткай
І на цэгле раджае звон...
Ваганэтка за ваганэткай...
І на сонцы сохне бэтон.

А ўгары,
дзе пяюць антэны,
Дзесь высока, там—угары
Засьпявалі на ўзвышшы сьценаў
Вясёлыя муляры —

Ну і цэгла —
Лёгкі звон —

Урастае
У бэтон...

Сёньня далей
Узрасьце
Вышыня
Каменных сьцен.

Дым заўецца
У простор.
Загудзе,
Паймчыць мотор.

Нашу цэглу,
Нашу сінь
Скалатне
Разгон машын.

Вокліч звонка
Ўдарыць шыры —
Пяцігодка
За чатыры.

Пяцігодка —
Рух гадоў...
Наша цэгла —
Наша кроў.

Ну-ж вы, хлопцы,
Болей цэглы!
Трэба хутка
Скончыць цэх нам!..

Мур высокі і весела цэгла
Ў муляровых руках зьвініць...
Хутка будзе тут гоман цэхаў
І заводзкіх вакон агні.

Я спыняюся ў захапленьні,
Песьні слухаю муляроў...
Мур кідае даўгія цені
І вясёла пульсуе кроў.

Знаю —
        край мой ідзе ў змаганьні
За машыны,
            за кожны мур.
Узьнімаюцца рыштаваньні
Цытадэльлю вялікіх бур.

# *НА ЎСХОД СОНЦА*

* * *

У разьмернасьць строгую слоў
Укладу я сягоньня жаданьні.
Песьня зьнікне і прыдзе ізноў,
Завіхруецца палкая кроў,
То—змаганьне.

Як гавораць, мінаюць гады...
Дзень мінае, прыходзіць наступны.
Дзень наступны—дзень малады
Парываньняў і клопатаў рупных.

Дзень наступны! Вітаю цябе
Ў жыватворчым і радасным плёне...
Ў гордым ходзе і барацьбе
Зьменіш ты агнязарнае Сёньня.

У тваё залатыя агні
Зазірнуць-бы...
а потым хай грозяць —
Хоць і сьмерць... хоць і гэтыя дні,
Абарваныя на паўдарозе.

## У ВАГОНЕ

*Юлію Таўбіну*

Я еду ў вагоне ў ліпнёвую ноч,
Ліпнёвыя ветры пяюць за вакном,

Ліпнёвыя ветры, раскінуўшы дым,
Цягнік даганяюць, сьпяшаюцца з ім...

Праносяцца міма, стаяць ля гары—
Далёкія гоні, чужыя бары...

Цягнік прамінае—сьпяшыць на начлег,
Яшчэ не закончаны ночны прабег...

Ягоная справа—вязі і гані!..
Мне сумна ў вагоннай сядзець цішыні.

Пытаю ў суседа—куды едзе ён,—
І ён неахвотна гаворыць праз сон:

Вось тут недалёчка паўстанак, а вы?..
І сон адганяе кіўком галавы.

Спрачаюцца колы пад намі ўначы,—
Цягнік ня спыняецца—далей імчыць...

— Я еду далёка-далёка, стары!..
Ў далёкія далі, ў другія краі...

Цягнік праімчыцца шмат цёплых начэй,
Пакуль даімчыцца да мэты маей...

Ня мала ля станцый, для новай хады,
Цягнік будзе браць і апалу й вады,

Каб вуглем сагрэць у дарозе нутро,
Каб смагу яму прахалодзіць вадой...

— Далёка, каханы мой!—дзівіцца дзед—
І, пэўна, ня мала каштуе білет?!.

— Стары! За дасяжнасьць да мэты маёй
Плачу я гарачаю, чыстай крывёй—

Найлепшыя грошы, найлепшы разьлік—
Струменьні натхнённай юнацкай крыві.

Разьліць гэту кроў і аддаць за вясну,
За тысячы вёснаў, за мэту адну!..

— Штосьдзіўна, каханы мой!—дзівіцца дзед—
Такога разьліку ня бачыў нідзе...

Я быў у акопах, страляў на франтох,
І ліў сваю кроў на Маньчжурскіх палёх,

Прыгнёт я трываў і пакуту, і зьдзек,—
Твайго-ж я разьліку ня бачыў нідзе...

— Маўчы, безразважны, пакутны стары!..
Мы кроў аддаем за другія краі...

Краі будаваньня і мараў палац—
За гэта крывёй толькі можна аддаць!..

Аддаць сваё сэрца і кроў, і вясну—
За тысячы вёснаў, за мэту адну!..

... Цягнік даў прарэзьлівы моцны гудок.
Сусед мой заснуў, паваліўся на бок...

Цягнік закрычаў і заляскаў мацней
У знак, што зусім разумее мяне...

Ён мчыцца нэрвовы... Ў запале імчыць,
Кідаючы крыкі у ціхай начы,

Ліпнёвыя ветры, раскінуўшы дым,
Цягнік даганяюць, сьпяшаюцца з ім.

1929 г.
Менск—Ворша

## РУМЕНКІ З РАДЗІМЫ

### 1. ВУЗОРНЫЯ ЛІШТВЫ НА ДОМЕ

Вузорныя ліштвы на доме,
На ліштвах рукою гарэзнай
Якісьці мастак невядомы
Цудоўных фігур навырэзваў.

А там, у вакне, з-за фіранкі
Дзяўчына глядзіць і сьмяецца
І штосьці таўчэ беспрастанку
Ў бліскучай мядзянай мяжджэрцы.

Ударыць і ўдар мэталёвы,
Як музыка, чуцен адгэтуль,
І песень вясёлыя словы
Раджаюцца ў сэрцы поэты.

Радачка, ну дзе цябе знаў я?
А стрэча ізноўку ці будзе?..
Мне сум нешта зноў заціскае
Мае непакойныя грудзі.

Скажы!..—а дзяўчына фіранкай
Закутала вокны са сьмехам...
І сьмех на вішнёвым прыганку
Рассыпаўся срэбным рэхам.

На даху ўсьміхнуліся ляскі,
Замоўклі ў цішы вакяніцы...
З якойсьці забытае казкі
Мне гэтая песьня трызьніцца.

1929 г.

## 2. РАЗЬВІТАНАК

Забывайцеся, цьмяныя ночы—
Маё першае цяжкае ліха!
За твае нявыказныя вочы
Я па сьвеце пашоў маталыгай.

Не такі ўжо я прыкры лагоднік,
Каб аддаць свае песьні за лоні.
Маё сэрца гарыць, як паходня,
На пустым неўзараным аблоньні.

Пацалункамі вусны мне паліш,
Але вось з улюбёнай купалкай
Разьвітаецца заўтра купаліш
Кучаравы, зялёны і палкі.

Пацалункамі вусны мне паліш
І заходзіцца сэрца ад болю..
На ірдзельным зялёным купальлі
Я зьнячывілі кінуўся ў поле.

Прывітайце, лясы і даліны,
Затуманьце чарнявыя вочы!..
Конча ў сонца шукаць цяплыні мне!—
Яе ў сэрцы знайду колькі хочаш.

Дык забудзьцеся-ж, палкія ночы—
Маё першае горкае ліха!
За твае нявыказныя вочы
Я на сьвеце пашоў маталыгай.

Верасень 1929 г.
Смаленшчына

### 3. ВЫБЯГАЛА ЛЮБАЯ З ХАТЫ Ў ПРАВОДЗІНЫ

Выбягала любая з хаты ў праводзіны,
Сьцежкі ўпрыгожыла гольлямі смуродзіны,
Як ішла ў праводзіны.

А за тымі сьцежкамі ў далячыні пеннай
Зара-зараніца мыецца купенай,
Белаю купенай.

Белаю купенаю, ціхімі стакроткамі,—
Каб-жа тыя сьцежачкі ня былі кароткімі,
Ня былі кароткімі.

Дзякуй табе, любая! Я даю абетку—
Завітаю хутка я, завітаю ўлетку,
Завітаю ўлетку.

Сустракай на выгане ўвечары ў нядзелю
З звонкімі лічбанамі, з яркаю бандэляй,
Сустракай ў нядзелю.

Завітаю ўвечары, завітаю ўпрыцем
З доляю шчасьліваю ды з інакшым жыцьцем,
З доляю і з жыцьцем.

1929 г. Красавік
Смаленшчына

## ШЫРОКАЕ ПОЛЕ, БУЯНЫ РАЗГОН

*Ю. Таўбіну і А. Куляшову*

Шырокае поле, буяны разгон...
Ах, песьні, ах, песьні!
Я склаў вас нязграбна...
Крыштальнага неба глыбокі затон
Хвалюе шырокага травеня радасьць.

Гады за гадамі ідуць у нябыт,
Мінаюць гады за гадамі,
Мае радакі, дарагія сябры,
Ці-ж сонца юнацтва ня з намі?!

Мы гэтак нядаўна ад вёсак прышлі
І вось пацяклі бесканцова—
І вечная праца ў прасторах зямлі,
І любая праца над словам.

Нас часта хвалююць зданьнёвыя сны,
Блуканьні далёкай Трырэмы,—
І часта мы рокат і шолах лясны
Прымаем за словы поэмы.

Мае радакі, як шырокі палі!
Юнацтву вялікаму—слава!
А гэтыя ўзьлёты і росквіт зямлі
Ці зможам у песьні уславіць?

Шырокага неба вясёлая муць
Хвалюе вясновую радасьць...

Ах, песьні, ах, песьні,
Чаму-ж вас, чаму
Я склаў так няўдала, нязграбна?

1929 г. Лістапад
Мсьціслаўль

* * *

Хвіліны мучэньня,
Хвіліны пакуты...
Упіваю натхненьне,
Як чарку атруты.

Як чарку атруты,
Як роспачны стогн
Над беленькім скруткам
Зьмярцьвелых лістоў.

Хай верш мой раскажа,
Пад воплеск і зьвень,
Пра бойкі адважных,
Пра сёнешні дзень.

Пра наша натхненьне
Вячыстых будоў
Суровым гарэньнем
Растопленых слоў...

Хвіліны мучэньня,
Хвіліны пакуты...
Ўпіваю натхненьне,
Як чарку атруты...

Ї буду шчасьлівы,
Калі гэты сьпеў
Праймчыць па краіне
У плённай сяўбе.

Калі ён пакліча
Бязьмежную раць
Дарогай косьмічнай
Їсьці будаваць.

Калі праімчыцца
Між родных мне мас
Бунтоўнае, гордае—
— Наш!

1929 г.
Мсьціслаўль

## ЛІРЫЧНАЯ ЗІМА

Як вецер песьні запяе,
Пад зімавых завей разьбегам,
Агні юнацкія поэм
Завеяць студзень хоча сьнегам.

Ён разрысуе вокны мне
Цьвятамі дзіўнае краіны...
Ў сумётах стане сыпкі сьнег
І разуквеціць сосны іней.

Камін загасьне агнявы,
Як дроў бярозавых ня хопіць,
І завіецца, як жывы,
У жэрале зьмярцьвелы попел.

І пойдзе вецер, як жабрак,
З сьняговай торбаю жабрачай...
Са злосьці сьвісьне у кулак,
З тугі заенчыць і заплача.

Ён будзе йсьці сабе ў прастор
Ад вёскі шэрай і да вёскі,
І будзе слухаць чорны бор
Шалёных песень адгалоскі.

Радача любы, ты з пуцін
Паўночных веяў і сумётаў
Ка мне да хаты прыляці
У час натхненьня і самоты!

Прыдзі, як будзе сьніць зямля
Пра дні вясны зялёнавокай,
І грукні ў дзьверы: „Гэта я
Прымчаў з шляхоў сваіх далёкіх"...

Тады патроху раскажы
Пра горды сум дарогі сьнежнай,
І пра Уралу рубяжы,
І пра сібірскі гул таежны...

Як сьпяць на поўначы маржы,
Як сьпяць норвэскія фіорды...
Як ля ільдзістае мяжы
Лёг акіян халодна-горды.

Я зачаруюся на міг
І пад сьняжыстыя павевы,
Пад гул дарогаў сьнегавых,
Складу вясновыя напевы...

Румянкі яркія поэм
Зачырванеюць на марозе...
А ты—мне песьні запяеш
І сьнегам стукнеш на парозе.

1929 г. Сьнежань
Мсьціслаўль

*

Добры дзень, мая красуня,
Беларуская зіма!..
Ля дарог бялеюць пуні
І стаяць кляны тарчма.

На абветраным прасторы
Сьнег праносіцца ў імглу...
І шапоча, і гаворыць,
І нямее на шляху.

І пад ветра гучны посьвіст
Над сумётамі лагчын
Пяць дарог сышліся ў ростань
І пабеглі ў далячынь.

З аднаколерным абліччам,
З гібкім выкрутам зьмяі
Пабрысьці з сабою клічуць
У нязнаныя краі.

Палі белыя палотны
На далёкія шляхі.
Адзінота. Адзінота...
І наўсьцяж сьнягі, сьнягі...

Мару, думаю і шчыльна
Прытуляюся да стрэх.
У палёх нібы дзяўчына
Рассыпае ціхі сьмех.

Паглядае з-за сумётаў
Ля маўклівага сяла
Казка-сон, што незваротна
Адыйшла і адцьвіла.

Мары, мары і лятункі!..
Гэта бродзіць—грае кроў...
Палкасьць слоў і пацалункаў
Не вароціцца ізноў.

На асьнежаным прасторы
Ветры коцяцца ў імглу...
Сьнег ляціць і не гаворыць,
І нямее на шляху.

Сьвежым сенам пахнуць пуні.
Мары, мары... усё хлусьня!
Добры дзень, мая красуня,
Нявыказная зіма!..

Студзень 1930 г.
Мсьціслаўль

## ЛЕС

Зноў ты, лес! Дыхнуў і будзіш сілы...
Зноў шумяць дубовыя лісты.
Лёг таемна змрок зялёна-сіні
На твае вяршыні і кусты.

Сьцежка, пратаптаная зьвярамі,
Цягне у нязьведаны паход.
На траве—вясёлкавыя плямы
Сонца і расквечаных лістот.

Радасна і шумна лес ракоча...
Ён—ня мне. Я знаю, што ня мне...
Кожная галінка і лісточак
Ладзіць гімны просьпе і вясьне.

Ў гэтым шуме—радасьць і прыгожасьць,
Лес шуміць і шастаюць лісты.
Ногі дзеразою мне трыножаць
Нізкія пукатыя кусты.

Я блукаю... Сьцежку загубіў я...
Ўсюдых лес... Навокал звон лісьця.

Хіляцца з насьмешкаю рабіны.
Ясені ад сьмеху шалясьцяць.

Ціха йду. Шумяць-зьвіняць асіны.
У траве зьвярыныя сьляды.
Зноў ты, лес... Дыхнуў і будзіш сілы,
І шумяць дубовыя лісты.

1929 г. Чэрвень
Смаленшчына.

## ПА ВЯРШЫНЯХ ШУМНЫХ СОСЕН

Па вяршынях шумных сосен
Хісткім крокам крочыць сьвежасьць.
Узьняліся ўгору, ў просінь
Бору гольчастыя вежы.

Мора моху. Мухаморы
Чырванеюць на узьлесьсі.
Лес пралесак. Росы—зоры.
Тонкіх тропаў шэпты-песьні.

Добра крочыць стромкім борам,
Соннай сьцежкай слацца слаўна!
І душу аддаць прасторам,
І забыцца ў стоме баўнай.

Ціха йду. Ліецца просінь (?)
Праз ігольчастыя вежы.
Па вяршынях шумных сосен
Хісткім крокам крочыць сьвежасьць.

1930 г. Чэрвень

* * *

Пакідаю, пакідаю
Вуліц роспачны прыбой,—
Чую неба расьцьвітае,
Чую зоры над сабой.

Прада мной гарыць зарою
Казкі—захаду пажар.
Нада мною, нада мною
Залатыя зьвеньні хмар.

Пабрыду цяпер туды я,
Дзе шырокія сады,
Дзе на гоні залатыя
Дождж павіс, як сіні дым.

Дзе у квецені красуе
Вечны травень, вечны госьць...
... Дзе натхнёнаы я пачую
Ў кожным слове—*маладосьць.*

## З НІЗКІ „ПАЎДЗЕННАЕ МОРА“

### 1. НА ЎЗМОР'І ВЕЧАР...

На ўзмор'і вечар. Ціха яркне
Абрыс вячэрніх, сонных хваль...
Сваю любімую, татарка,
У гэты вечар засьпявай!

Арлы рлуюць у небе зранку
І ў горы кружацца назад...
Яназаву цябе, каханка,
Звычайным імем—Хацімат!..

Чамусьці сэрца у трывозе
Ў прыбой вячэрні і туман...
Сьпявай, што-небудзь на парозе,
Мая красуня—Хацімат!..

Аб чым, пытаеш?.. Хоць аб моры!
Яго я бачу ў першы раз...
Сьпявай аб тым, як гаснуць зоры
Ля вашых хат у ночны час!..

Сьпявай аб тым, як навальніца
Шукае морскія шляхі,
І з дальняй Турцыі зарніцы
Маўкліва ліжуць небасхіл.

Аб тым, як шквал зьлятае раптам,
Узьбіўшы валаў морскі хмель,
І як бяз ветразей і мачтаў
Імчыць на скалы карабель.

Мне любы віхраў завываньні
І рокат мора у валох,
Бо ўсё жыцьцё ідзе ў змаганьні
І дні ідуць мае ў шляхох...

Сьпявай, красуня!..
Сёньня—штылі...
І дрэмле мора далягляд.
Глядзі—ў якой маўклівай стыні
Далёкіх гораў вадаспад!..

Сьпявай, пакуль загаснуць зоры!..
А заўтра—пойдзема з табой
Зьбіраць у кошыкі па ўзмор'і
Што занач выкіне прыбой...

Жнівень 1929 г.
Аяушта

## 2. У ПОРЦЕ

Цэлы дзень ішла работа ў порце.
Разгружалі баркі, караблі...
Цэлы дзень у морскай пазалоце
Сьнегавыя ветразі плылі.

У партовым горадзе заўсёды
Галасоў шумлівы перабой,
Пераборы морскія мэлёдый
І ў суровым рокаце прыбой.

На масткох смуглявыя матросы
Колькі песень ведаюць такіх
Аб краінах казачна-заморскіх
І тубылках стройных, агнявых...

Цэлы дзень ішла работа ў порце...
Ля затокі швэндаўся народ.
Нагружалі грузчыкі бясконца
Акіянскі грузны параход.

Заўтра, толькі ноч пакіне бераг—
Паляціць над бухтамі туман...
І да порту Рыо-дэ-Жанэйро
Паплыве заморскі капітан.

Мора шэпча ласкава і квола
І калыша ціха караблі...
Паплыла мэдуза каля молу
Да крутой базальтавай скалы.

Сьпяць пад сонцам сінія прасторы,
Вецер ціхі хваль не скалыхне...
— Ёсьць у вас, у Беларусі — мора?
Запытаўся нехта у мяне.

Я сьмяюся весела й пацiху...
У канатах вецер шалясьціць.
Мора дрэмле, мора сыпле іскры,
Як агні паўночныя зарніц.

Жнівень 1929 г.
Севастопаль

* * *

Хвалі сонныя, хвалі дрымотныя мне
Сны забытыя зноў нагадалі,
Ты, мой прывід, плывеш, і на хісткім чаўне
Ловіш сонечнай сеткаю далі.

І на дне,—мабыць, гэткая-ж сьвежая гладзь,
Прахалода і сонечных блікаў трымценьне...
Бачыш—тонка-празрыстыя, ледзьве відаць—
Парасоны мэдуз на падводным каменьні.

І ніжэй, дзе сузмрок сіняваты імгліць,
Сьцены белай маланкаю ціха мільгнулі...
Дрэмле морскае дно і стаяць караблі,
Што з камандай калісьці даўно патанулі.

Пэўна—
бура была... наляцеў гураган...
Цераз палубу хвалі салёныя білі...
Зьбіты хваляй шалёнаю быў капітан
І у ветразях глуха вятры галасілі...

Ноч і бура схавалі на дно караблі,
А як сонца плыло ў супакоеных далях,—
Мора ціха сінела... мэдузы плылі
І бялявыя чайкі купаліся ў хвалях.

З таго часу праходзіць па палубе краб
І за бортам хаваецца хуткі і жвавы,
Дзе схіліўся матрос, апускаючы трап,
Са сьмяротнай усьмешкай на твары кастлявым.

1930 г. Ліпень
Ялта

## 4. ВЕЦЕР НА МОРЫ

Быццам неба,—шырокае сіняе мора.
Бесканцовасьць і дальняя сіняя муць.
Я стаю на сьпякотным пажоўклым узгор'і,
Там, дзе сонца і яшчаркі ў скалах жывуць.

Нескончоныя хвалі у безе разгонным
Панясьлі мае думы, памкнулі кудысь,
Гаварлівых цыкадаў цымбальным стазвонам
Зачарована дальняя сьветлая высь.

Раптам...
Хмары набеглі, і даль пацямнела,
Забялеліся хвалі саянам сьнягоў.
У сталёвыя колеры ўбралася неба
І па моры узмахамі вецер прайшоў.

І ад гэтай хады закудравіўся пенай
На затопленым пляжы рытмічным прыбой.
І паймчаліся хвалі, як белыя сьцены,
Пасправацца з далёкай пустой сінявой.

Але вецер праймчаўся...
і даль задрамала,
І чарнявыя скалы заснулі ізноў,
Супыніліся разам шумлівыя хвалі
І нібы апусьціліся з пенай на дно.

Зноў-як неба, шырокае сіняе мора.
Караблі адплываюць у казачны край.
Жоўкнуць, сьмягнуць у сьне залатыя узгор'і.
Між падворных каменьняў застыў чорны краб.

Сэвастопаль-Хэрсонэс
1930 г.

## 5. СЬЛЕД ХЭРСОНЭСІТА

На пасьцёртых часам плітах—
Часам ветру і слаты
Гандляроў-хэрсонэсітаў
Бачу хцівыя сьляды.

Іх разьбітыя узоры
Колёнад і гожых пліт
Распласталіся на ўзмор'і
Грудай цэглы і зямлі.

У музэі ганарліва
Пазіраюць праз узор
Без афонскае аліфы
Стаі белыя амфор.

Вось на каменнай аблоне
Пад нястройны звон цыкад
Храм Зэвэса й Аполёна
Дыша рэштай колёнад.

З тога боку бухты сіняй
З дальніх, казачных краёў
Прабіраліся элліны
Да таўрыдзкіх берагоў.

Там, за берагам зялёным,
Дзе расьце магутны лес,
Мчацца скіфскія плямёны
Грабіць буйны Хэрсонэс.

Ды сьцяна стрымае плыні,
Скіфы з скалаў уцякуць,
І заморскія элліны
Да Таўрыды прыплывуць.

Будзе зноўку гандаль плённы
Перад храмамі багоў,
Зноўку барбараў плямёны
Хлеб дадуць ім і рабоў.

Пройдзе век і новы прыдзе
На узвышшы белых сьцен...
Колькі будзе у Таўрыдзе
Нячувана новых зьмен!

. . . . . . . . . . . . . .

Час прынёс другія плыні.
Скіф ў кургане дзікім сьпіць
І заморскія элліны
Сьпяць у плесені грабніц.

Старажытныя кавалкі
Точыць мора з зор да зор,
І на дне хаваюць хвалі
Чарапкі былых амфор.

Дышуць сьцены. Дышуць міты.
І разбурваюць гады
Гандляроў-хэрсонэсітаў
Урачыстыя сьляды.

1929 г.
Крым. Хэрсонэс

## 6. ПОЛУНДРА

Аб каменьне мора б'ецца,
Караблі на бухты ймчацца.
Вецер, скалы... Скалы, вецер.
Ймчыцца пены белай сьмецьце
Пацярухаю купчастай...

Сьцеражэцеся, матросы,
Раззлаваных морскіх нетраў!
Паглядзеце—альбатросы
Нізка рэюць, і так злосна
Гафэля гаворань з ветрам...

Налятае шквал і разам
Грудзі ветразям зрывае...
Б'е у бераг пенным пасам,
Падымае хваляў масы
І рагоча, і гуляе...

Зачарованы разьбегам
Ветраў, хваляў белакудрых,
Шумна ў мора ймкнецца бераг
І крычыць у пене шэрай
Хрыплым голасам:—„Полундра!"...

Аб каменьне мора б'ецца,
Залівае валам плёсы...
Вецер, скалы... Скалы, вецер...
Ймчыцца белай пены сьмецьце...
— Сьцеражэцеся, матросы!!!

1929 г.
Сэвастопаль.

* * *

Ўсё, што ў душы, як іскра́, захавана,
Выбухне часам і кветкай блісьне—
І загалосіць струнай злататканай
Аб жыцьці і вясьне.

Думкі глыбокія ў сэрцы так доўга хавалі!
Сьпейце, гадуйцеся! Прыдзе вясна—
Ўсё расквітнее ў сусьвеце у Маі.
Прыдзе вясна!

Вы, мае думкі, таксама гадуйцеся, сьпейце!—
Ўсё, што ў сэрцы юнацкім таю...
Выльлю вясной на расквечанай флейце
Думку сваю.

23/II 1928 г.
Мсьціслаўль

# НОЧ НА СТАНЦЫІ НЕГАРЭЛАЕ

## НОЧ НА СТАНЦЫІ НЕГАРЭЛАЕ

### 1. ЗАХАЦЕЛАСЯ НОВЫХ НАСТРОЯЎ І СЛОЎ

Захацелася іншых настрояў і слоў,
Скласьці думкі вясновыя ў новым парадку.
Растрывожаны гул дымавых цягнікоў
Праімчаўся з вятрамі па пыльнаму тракту.

Захацелася ехаць у дальнюю даль
Па шырокай, як сьветлае неба, краіне...
Апранаецца сад у зялёны паркаль,
І у небе віры каламутнае сіні.

Вось тады, пакідаючы станцый агні,
Патыхаючы дымам і нафтавым пахам,
Адыходзіў ад Менску бясконцы цягнік
І па рэйках зьмяістых сьпяшаўся на захад.

Бо яму усёроўна кароткі прагон
Праімчаць з паравознаю дымкаю шызай.
І яго не ўсхвалёўвае слова—кардон,
І ў яго на мяжы ня пытаюцца візы.

Ї вось гэткім звычайным, якім і прышоў
У палі Беларусі з далёкіх лагчынаў,
Будзе ймчаць ён спакойны за нашай мяжой
Ї па рэйках грымець і ўздрыгваць няспынна.

Ён магутным гудком не адзін страсане
З невядомых паўстанкаў свайго падарожжа,
Ї ня зьдзівіць—на станцыі польскі жаўнер
Ї над станцыяй дзёрзка узьнесены „ожал“.

Бо яму абыякавы станцый агні,
Шмат мінуў ён іх з дымам і нафтавым пахам.
Адыходзіў ад Менску у далеч цягнік
Ї па рэйках сьпяшаў за кардоны, на захад.

## 2. АХ, НЯ Ў ГЭТЫМ-ЖА СПРАВА!

Шмат я станцый страчаў у вандроўнай начы,
Але гэтай апошняй ня бачыў ніколі,
Што ўвесь сьвет падзяляе на наш і чужы
На прымежным краі беларускага поля.

За якою—інакшасьць і песень, і мэт,
Ї гады праплываюць ня нашай чаргою,
За якою другі, мной нябачаны сьвет,
Ї жыцьцё прамінае зусім падругому.

Я люблю Беларусь, як каханак, як сын.
Ї таму ня трываю пякельнага болю,
Што пастаўленым слупам, дзе шэпчуць лясы,
Падзяляецца напал радзімае поле.

І на гэтай палове, дзе ўсе мы жывем,
І дзе нашая доля ўзрастае, мацнее,
Мы складаем пякельныя песьні поэм,
Што дыктуюцца словам пахмурага гневу.

Ах, ня ў гэтым-жа справа, што ёсьць Беларусь
На Ўсходзе й на Захадзе!..
Справа ня ў гэтым!
Гэта станцыя ставіць глухую мяжу,
Для ўсяго нявыказна-вялікага сьвету!

І калі уяўляю, што там, за мяжой,
Вісьне чорная ночка у колеры сажы,
Мне шкада не аднэй Беларусі маёй,
А падзелены сьвет неабсяжны.

Можа ў час, калі гэтыя словы пішу,
Недзе там, за мяжой, за кардонам,
У Эўропе, начная трывожная жудзь
Прарываецца крыкам і стогнам.

І для тых, хто вясьне пракладаў сьляды,
Патэнтованы кат і разбэшчаны вораг
За нянавісьць да іх, за змаганьня гады
Піша чорнай рукою сваёй прыгаворы.

Не хапае душы зьмерыць гэтую жудзь
Аніякаму ў сьвеце поэту.
Гэта станцыя ставіць глухую мяжу
Для ўсяго нявыказна-шырокага сьвету.

### 3. ЯК КУДРЫ БЕЛЫЯ БЯРОЗ

Як кўдры белыя бяроз,
Шуміць вясновы сьвежы вецер.
На Негарэлае прывёз
Мяне цягнік у гэты вечар.

І потым далей ў ноч і сон
Ў разгоне шпаркіх кілёмэтраў
Праймчаўся зданьню за кардон
З красавіковым сонным ветрам.

І вось тады ў трывожны шум
Глухіх палёў і дум поэта
Глядзеў я доўга на мяжу,
Мяжу зямлі шырокай сьвету.

Вось там, пад лісьця сонны звон,
За колькі шпаркіх кілёмэтраў
Ўрываюцца цераз кардон
Савецкія начныя ветры.

Ляцяць бяз візы ў поля гладзь
Да польскай дальняе Варшавы
Чужым штандарам расказаць
Пра гордасьць нашую і славу.

Лятуць, мінаючы вагзал,
Вартуючы начную цішу,
Каб даць натхненьне і запал
Асуджаным глухіх Лукішак.

І там далей, праз ноч і жудзь
І неабсяжныя дарогі
Ў палац міністрам прынясуць
Начную хісткую трывогу,—

Што па фабрычных гарадох
Расьце пажар нямых ваколіц,
Што ноч над зьмеямі дарог
І што на крэсах непакойна.

Праймчаць у ночнай сіняве
Над Мусаліні, рымскім папай,
І зноў напомняць, што сусьвет
Падзелены мяжою напал.

### 4. ДАЛЁКА НЕДЗЕ ЗА МЯЖОЙ

Далёка недзе за мяжой,—
Я бачыў—ночкай гэтай весьняй
Сядзіць за хмураю сьцяной
З глыбокай думкаю прафэсар.

Пад шум прыцішаны вятроў
Ён, самаўпэўнены і горды,
Атруту новую знайшоў,
Што бліскае ў яго рэтортах.

Прад ёй—нішто і льюізіт!..
Яна—найлепшая ў паходзе.
Аб ёй складзецца жудкі міт
Для эр наступных і стагодзьдзяў.

Яна задушыць гарады,
Краіны, дзе расьце змаганьне,
І людзі ўкленчаць ад жуды
Ў сьмяротным золаце туману.

Яе паклічуць, і яна
Пальецца рэчкаю з балёнаў
На травы ціхія палян
І на вайсковыя калёны.

І прынясе разлом і жудзь
На бою ўзрушанае поле.
І зноў колёніі ўзьнясуць
Суровы шта́ндар мэтраполій.

А зрэшты, будзе ўсё адно—
Каму прадасьць яе профэсар.
Ён заўтра стане за сьцяной
Глухіх вайсковых міністэрстваў.

І вынаходка пойдзе ў ход,
І зброяй зробіцца чужою
Ў агідны варажы паход
На край, што недзе за мяжою.

І я вось бачу, як плыве
Сьмяротны газ, за ім—бязьлюдзьдзе...
І людзі валяцца ў траве,
І рвуць атручаныя грудзі.

За батальёнам батальён
Мярцьвее, жудасны, бяствары...
І сьмерцю харкае балён,
Ахутаны атрутнай хмарай...

Вятры павеялі ізноў,
І вось расплыўся, зьнік профэсар...
Агнямі белых ліхтароў
Гарыць савецкае паўпрэдзтва.

У горадзе варожым ноч,
Кварталы сьпяць у дымцы шэрай.
Мігцяць выразна за вакном
Паўпрэд і постаць дыпкур'ера.

І весткі дыпкур'ер прынёс
З свае далёкае краіны,
Што ў краі сосен і бяроз
Штучас гучней гудуць машыны.

А ветры гойсаюць ізноў,
І ноч на вуліцах імкнецца.
Агнямі белых ліхтароў
Гарыць савецкае паўпрэдзтва.

### 5. БАЧЫЎ Я ДАЛЁКУЮ ВАРШАВУ

Гэтай ночкай сіняй, кучаравай,
Пад лістоў красавіковы звон,
Бачыў я далёкую Варшаву,
І над ёй—вялікі, чорны сон.

Смутны змрок віецца вышай, вышай.
Я гляджу, як на грудзёх зямлі
Сьпяць на захадзе агні Парыжу,
І Варшавы сьцены паляглі.

Сьпі, Парыж! Сьпі, чорная Варшава!
Край начэй і чорных турмаў, сьпі...
Гонар ваш і змрок агіднай славы
Адгараць у сурмах барацьбы!

Час 'шчэ выйдзе ў грозных боек поле,
Час разломаў буйных і навал,
І гудкамі гарадзкіх ваколіц
Праімчыцца ваш дзевяты вал.

Праімчыцца нячуваным госьцем...
— Хто прыгнаў? Навошта? і адкуль?..
І напоіць сэрца гневам гострым
Даўніх крыўдаў, зьдзекаў і пакут.

І тады, зламаныя імпэтам
І віхром разьбітыя нашчэнт,
Вы адказ дасьце ўсяму сусьвету
За жуду бяскрайную начэй.

Сьпеце-ж покуль! Сьпі, Парыж, Варшава!
Край начэй і чорных турмаў, сьпі!
Гонар ваш і змрок агіднай славы
Адгараць у сурмах барацьбы!..

### 6. ЦЯГНІКІ ГРЫМЕЛІ

Цягнікі грымелі ды імчалі,
Пад лістоў красавіковы грай...
Разам з сонцам залацелі далі,
Загараўся раніцаю край.

За вакном міналі кілёмэтры
І з палямі роснымі плылі.
І што час мацней сьпявалі ветры
Пра вясну, пра радасьці зямлі.

Што Бэрлін! Што чорная Варшава!
Калі у краі, пад вясновы звон,
Наша доля сьпее з нашай славай
Ў віхраваньні гэтых сьветлых дзён.

І таму, у дні трывог і буры,
Родны край мой, творца і поэт,
Я вітаю звонкія віхуры,
Што агорнуць песьнямі сусьвет.

І цябе вітаю, край машынны,
Што да нас завітвае цяпер!..
З добрым раньнем, вольная айчына,
Аванпост СССР!

Май 1930 г.

КАНЦЫ ПОЭМЫ

## КАНЦЫ ПОЭМЫ

*Ул. Хадыку*

### 1. ПРОЛЁГ

Сядзіць нахмураны поэта,
Ў пакоі ціха, вечар цёмны.
А сьцені туляцца ад сьвету
І па кутох стаяць сукромных.

Поэта быў сапраўдны лірык
І, калі ўзяўся за поэму,
Ён разгарнуў глыбінь і шыры
У знойдзенай нядаўна тэме.

У ёй быць мелася сучаснасьць,
Узараны трактарам палетак,
Жывыя людзі, дні колгасу
І шмат падобнага на гэта.

І, напісаўшы колькі словаў,
Пад шчырай лірыкі разводзьдзе,
Поэт хадзіў, кусаў аловак
І слоў далейшых не знаходзіў.

І вось тады, з прычыны гэтай
(Здарэньне дзіўнае такое),
Устаўшы з-за стала, поэта
Зьвярнуўся да сваіх герояў.

Раней поэты гаварылі
Ці з чытачамі, ці з дзяўчынай,
А наш—ён быў дзівак і лірык...
Мажліва ў гэтым і прычына,

Што так зрабіў...

Прышлі героі
Натоўпам шумным і вясёлым
З глыбінь паэтавых настрояў,
З паэм румянкавых вясёлак.

Героям рукі ціснуў лірык
З усьмешкай цёплаю вясновай...
І прывітаў іх ветла, шчыра
Лірычнай палкаю прамовай.

ПОЭТА

Сядайце героі! На песенным тракце
Спаткаліся сёньня мы ў радасьці ўцешнай...
Са мною дасюль ня былі вы ў контакце,
Таму і хлусілі поэтавы вершы.

Я песьні шукаў у румянкавых далях,
На белых лагчынах завеямі ўкрытых.
Натхненьне шумуе, як штормы на хвалях...
Рыхтуйце пяро, паважаны мой крытык!

У цернях сумненьняў, пакуце балеснай,
У доўгіх дарогах няўтомны і ўпарты
Служу я табе, мая родная песьня,
І цьвёрда стаю ганароваю вартай.

Я гожае, ўздымнае ў сэрцы хаваю
З дзіцячых гадоў недасяжна далёкіх.
Натхненьня гарачыя пенныя хвалі,
Шырокае песьні спакойныя крокі...

Жыцьцё сустракала ня раз мяне хмарай,
Сьмяялася, кпіла гадзінаю весьняй
За тое, што ў гонар табе і ў ахвяру
Прынёс я сябе, мая родная песьня!

І ты расьцьвітаеш у белым тумане,
На сьцежках да сонца, да слаўнае мэты.
Вясна, чараўніца і зброя ў змаганьні
Залітая палкай крывёю поэты.

Героі, прабачце мне сум беспадстаўны!
Прабачце мяне ў адступленьні лірычным!
Я—лірык, як быў, так і ёсьць непапраўны,
Пакіньце-ж шаптацца, сьмяяцца скэптычна!

Ці знаеце ролі свае? Паўтарэце!—
Як будуць складаць яны нашую тэму.
І з роляў, завучаных цьвёрда, стварэце,
Як п'есу акторы—поэму.

Але пачакайце—сказаць я вам хочу
(Прабачце яшчэ раз маё адступленьне!)
Я хочу сказаць вам пра творчыя ночы,
Пра ваша зьяўленьне і нараджэньне.

Як вечар паўстане у постаці строгай
І дум на поэта узложыць бярэмя,
Таемным фэніксам з разьбітых настрояў
Раджаецца ў смутным абрысе поэма.

Што ў сэрцы кіпела і адгарэла,
І адгарэўшы, зьвярнулася ў попел—
Прымчыць да поэты, і ўладна, і сьмела
Ў палон непакойныя думкі захопіць.

Туманнай чаргою ў пакутах праходзяць
Бяссонныя ночы і творчыя раньні...
Поэта з героямі ладзіць паходы,
Вандруе у песенным вохкім тумане.

Плятуцца настрояў хаўтурныя клячы
Па рыфмаў заходжаным зьбітым мурогу...
Ах, як-бы хацеў ён герояў пабачыць
І з імі шукаць самай лепшай дарогі!

Каб сталі герої ў контакце з поэтай
Ў свайго нараджэньня ліхую гадзіну
І ў творы праходзілі злучана гэтак,
Зьяднана, агульна, у фронце адзіным.

Але, пад туман непагодны і шэры,
Поэта бяз шляху у песьнях блукае...
І дрэмлюць героі на белай паперы—
Ў жыцьці іх са сьвечкаю не адшукаеш.

Даволі-ж размовы! Пачнем-жа, героі!
Запомнілі ролі свае? Паўтарэце!
І з роляў раздадзеных, разам са мною,
Як п‘есу акторы, поэму стварэце.

ГЕРОІ

Заслона ўзьнялася. Акторы гатовы.
У поўным парадку шырокая сцэна.
Таварыш поэта, вам першае слова!
Поэта! Давайце пачатак поэмы.

ПОЭТА

*Адбываюцца падзеі*
*У пасёлку Забалотным...*
*Мчыць марозная завея*
*Сьнегу белыя палотны.*

*На загоны чорным трактам*
*Надышла нягод часіна—*
*Непаладкаў, непарадкаў,*
*Непакойнай бунтаніны.*

*Нехта сее чутку здраду,*
*Нехта муціць, агітуе,*
*Нехта новыя завады*
*Для колгасьнікаў рыхтуе.*

*Наліліся словы болем,*
*Думкі—чорным цяжкім жалем.*
*Сакратар ячэйкі Долін*
*На бюро казаў з запалам.*

ДОЛІН

*Комсамолія пасёлку,*
*Цьвёрда станем мы на варту!*
*Ставім гонар комсамольскі*
*І жыцьцё сваё на карту!*

*Муціць вёску маладую*
*Патаемны шэпт кулацкі...*
*Нашу вёску агітуюць,*
*Каб ішла супроць колгасу.*

СТАРШ. КОЛГАСУ КЛІМ

*Халімон ўсяму прычына!*
*З намі ён заўжды змагаўся.*
*За яго ўзяліся шчыльна*
*Як за ворага колгасу.*

*А другі—твой бацька, Долін,*
*Падпявала несьвядомы,*
*Што жыцьцё пражыў бяздольным*
*Пад царкоўным чорным звонам.*

*Трэці—поп...*
*Вось тройца-вораг!*
*Муцяць вёску маладую,*
*А народ гарыць, як порах,*
*Як яго наагітуюць...*

ПОЭТА

*Пад сьвіст завеі, ноччу цёмнай,*
*Як вецер грукае на ганку,*
*У папоўскіх вокнах сьвет таёмна*
*Гарыць за спушчанай фіранкай.*

*А за вакном, у бляску сьвечак,*
*За шклянкаю гарбаты—трое...*
*Сядзяць і гутараць аб нечым*
*Мае адмоўныя героі.*

ДОЛІН СТАРЫ

*Праклён! Праклён такому сыну!*
*Цяпер ня бацька ўжо яму я...*
*Зьвязаўся ён з нячыстай сілай,*
*Калі царквы ён не шануе.*

*Мой моцны божа! Запалі ты*
*Нячысьцікаў маланкай яркай!*
*У алтары ссыпаюць жыта?!*
*І ставяць поруч малатаркі?!*

ПОП

*Антыхрысты на сьвет прыходзяць,*
*Рыхтуецца Содом з Гоморай.*
*І сее смуту у народзе*
*Пракляты тройчы боскі вораг.*

ХАЛІМОН

*Хай чэрці кроўю захлынуцца!*
*Канец—ці брату там, ці сыну!*
*Ня дам колгасу разгарнуцца—*
*Ці зьнішчу іх, ці сам загіну!*

ПОП

*За гвалт страшэнны над царквою*
*Іх бог вялікі пакарае.*
*Ідзеце з чыстаю душою,*
*З малітвай на сьвятую справу!*

*Хай бога зноў убачаць людзі—*
*Як ён карае,*
*Як ён судзіць!*

ПОЭТА

*Разгарнуліся падзеі*
*У пасёлку Забалотным...*
*Круціць белая завея*
*Сьнегу хісткія палотны.*

*Як ішла ў завею Наста*
*З Клімам, з Доліным Андрэйкай,*
*Пад сьнягоў марозных шастань,*
*З пасяджэньня комячэйкі.*

*А насустрач, ля дарогі*
*Узьняліся*
*раптам*
*сьцені...*
*Стрэлам войкнулі аблогі*
*У сьмяротным дрыгаценьні...*

*Вецер гойдаўся з самотай*
*Над лагчынаю дрымотнай.*
*Паваліўся у сумёты*
*Клім у хрыпе прадсьмяротным...*

*І, пад чорную трывогу,*
*На завеянай лагчыне*
*Стаў адзін супроць другога*
*Цёмны бацька з родным сынам...*

ДОЛІН

*Тата! Ты?.. Заплямлен кроўю!*
*З кім прышоў ты?*
*З кім спазнаўся?*
*Што-ж, страляй! Ня маю зброі...*
*Бі!*

ДОЛІН СТАРЫ

*... Рука... не паднялася...*

ДОЛІН

*Хто? Кажы, хто быў з табою?*
*Хто цябе падвучваў, тата?*
*Хто табе даў гэту зброю?*

ДОЛІН СТАРЫ

*Халімон і поп праклятыя...*

. . . . . . . . . . . . . . .

*Сын, даруй мне! Закруцілі*
*З судным днём, з папоўскай верай...*
*Тфу, нячыстая ты сіла—*
*З кім ішоў? Каму я верыў!*

*Дзе яны? Ўцяклі... Няма іх...*
*Быў у іх руках я цацкай!..*
*Дум ланцуг вялі ў тумане*
*Пад усьмешкай здрадна-брацкай...*

*Сам аддаўся цёмнай сіле.*
*Сам... Каго-ж хацеў забіць я?*
*Сын, даруй-жа! Закруцілі...*
*Замуцілі... Што рабіць мне?!*

ДОЛІН

*Не ўцякуць! Нясем-жа Кліма!*
*Наста, дзе ты? Памажы мне!*

ПОЭТА

*А парою веснавою*
*Зелянелі шчасна гоні...*
*Выйшла дзьвесьце душ на поле*
*І з плугамі дзьвесьце коняй.*

*З палынамі ўзьмежкаў сонных,*
*Пад напружны хрып лямешны,*
*Роўна йшлі плугоў колёны*
*І разбурваліся межы.*

*Скарадзілі дружна, сьмела*
*На загонах з добрым часам...*
*Узрастала, зелянела*
*Радасьць сьветлая колгасу...*

. . . . . . . . . . . . . . .
. . . . . . . . . . . . . . .

І так поэма скончыцца павінна,
Што на ўзьбярэжжы нашых дзён сасьніў я:
У барацьбе цяжкой, няспыннай
Перамагаюць маладыя...

Поэмы будучай макет гатовы
І дух у працы творчай не аслабне.
Хай прымітывам тут здаюцца словы,
Радкі кульгаюць рыфмаю нязграбнай.

Заслона спушчана. Шаноўныя героі,
Прымеце дзякуй шчыры ад поэты!
Стаіць жывой поэма прада мною
І верш натхнёным полымем сагрэты.

Нітуйся, верш! Ты надта просты сёньня...
І простым быць сягоньня ты павінны,
Каб змог прайсьці, як добры госьць, на гоні
І да калгаснай хаты селяніна.

Цяпер за працу... Ў захапленьні творчым
Ляці па рэйках палкіх слоў, аловак!..
Зьлятайцеся чаргой бяссоннай, ночы,
І лірыкі ўзнэрвованае слова.

Ўзьнімайся думка—сын жывога часу!
Нясі да сонца творчыя імкненьні!
Агонь крыві і гонар маёй клясы
У росквіт дзён, праз чорнай ночы цені!

Ўздымайцеся агнём, радкі поэты,
Расьцеце ў рытмах, слоўныя крышталі!
Адно—ня йдзеце сьцежкай трафарэту
І ад насьледваньняў трымайцеся падалей!

## 2. ЭПІЛЁГ

1-й ГЕРОЙ

Нас дарма поэта турбаваў—
Склікаў нас і склаў сужэту шыры—
Ён поэмы той не напісаў
Наш гультайны непапраўны лірык.

Складзены героямі макет
Будучай нядрэннае поэмы
Прымітывам палічыў поэт
І таму расчараваўся ў тэме.

2-гі ГЕРОЙ

Я яго шкадую ад душы.
Бачыў я—адкінуўшы поэму,
Сёньня ён разьвязваў у цішы
Блытанасьць фінансавай проблемы.

Сёньня ён зваліўся ў крэсла зноў
І спакою доўга не знаходзіў
Ад хлусьні варожае „сяброў"
І ад новых кпінаў і нягодаў.

І ад горкіх думак і журбы
Разьліваўся слоў халодны воцат...
Ён хацеў адным поэтам быць,
А яго закоўвалі службоўцам.

Злыдні загараджвалі ўвесь сьвет
З думкаю за ілбом таўшчэзнай сталі,
Тыя, хто і аркуша, як сьлед
За сваё жыцьцё не напісалі.

3-ці ГЕРОЙ

Досыць, досыць...
Ведаем... Пакінь!
Вецер ломіць—пыл агорклы гоніць!
Разьбярэмся ў справах, радакі!
У чым поэта вінават сягоньня.

У лірычным песенным агні
Ён ня змог, праходзячы да мэты,
У радкі укласьці нашы дні,
Што мацней за самага поэты.

Мы—героі сонечных шляхоў
Праз вякі да блізкай перамогі!
Мы—мацней стакротна за яго
На жыцьцёвых сьцежках і дарогах.

Бо жыцьцё дало агонь адвагі,
Каб на хвалях сонца мы плылі...

2-гі ГЕРОЙ

... Таварышы, увага!
Да нас поэта піша ліст.

### ЛІСТ ПОЭТА

Даволі! Хопіць! Што рабіць!
З дзівоснай зьяваю такою!?
Мяне сабраліся судзіць
Мае уласныя героі.

Навошта недарэчны суд
Над вольнай песьняю поэты!
Ў жыцьцё натхнённа я нясу
Агонь агульнай нашай мэты.

Героі, прэч! Абрыдла мне...
Далой з пяра, бо перайначу!
Рабіў я тут экспэрымэнт,
Ці ўдаўся ён—я сам пабачу.

Героі, прэч! Бяжэце ўгрунь!
Хоць верш выходзіць і кароткі,
Але, як ёсьць—здаю у друк...
Поэма скончана!
Я стаўлю кропку.

Май 1930 г.
Менск

*Просьба да чытачоў прысылаць мне свае водзывы пра гэту кнігу па адрасе—Менск, Савецкая 68, Дом Пісьменьніка.*

*Аўтар*

# ЗЬМЕСТ

*Стар.*

На ўсход сонца . . . . . . . . . 3

**Краіне**

Агнямі і кроўю . . . . . . . . . 7
З поэмы „Вясна зямлі“
1. Напевы вясны . . . . . . . . 9
2. Задумайся, дружа. . . . . . . 11
3. У ходзе штодзенным . . . . . . 12
4. Жыцьцё інакшае . . . . . . . 13
5. Іду . . . . . . . . . . 14
На палёх . . . . . . . . . 16
Жніво . . . . . . . . . . 20
Гаварылі звонкія цапы . . . . . . 22
Зварот партызанаў. . . . . . . . 24
За мною далечы палёў . . . . . . 26
Цягнікі адгрымелі . . . . . . . 28
Бібліотэка . . . . . . . . . 30
З песень пра муляроў . . . . . . 34
Узьнімаюцца рыштаваньні . . . . . 36

**На ўсход сонца**

У разьмеранасьць строгую слоў . . . . 41
У вагоне. . . . . . . . . . 42
Руменкі з радзімы
1. Вузорныя ліштвы на доме . . . . 45
2. Разьвітанак . . . . . . . . 46
3. Выбягала любая . . . . . . . 47

*Стар.*
Шырокае поле, буяны разгон . . . . . . . 49
Хвіліны . . . . . . . . . . . . . . 51
Лірічная зіма
1. Як вецер песьні запяе . . . . . . . 53
2. Добры дзень, мая красуня . . . . . . 55
Лес . . . . . . . . . . . . . . 57
Па вяршынях шумных сосен . . . . . . . 59
Пакідаю, пакідаю . . . . . . . . . 60
З нізкі „Паўдзённае мора“
1. На ўзмор'і вечар . . . . . . . . 61
2. У порце . . . . . . . . . . . 63
3. Хвалі сонныя, хвалі дрымотныя . . . . . 64
4. Вецер на моры . . . . . . . . . 65
5. Сьлед хэрсонэсіта . . . . . . . . 66
6. Полундра . . . . . . . . . . 69
Усё, што ў душы . . . . . . . . . . 70

### Ноч на станцыі Негарэлае

1. Захацелася новых настрояў і слоў . . . 73
2. Ах, ня ў гэтым-жа справа . . . . . . 74
3. Як кудры белыя бяроз . . . . . . . 76
4. Далёка недзе за мяжой . . . . . . 77
5. Бачыў я далёкую Варшаву . . . . . . 79
6. Цягнікі грымелі . . . . . . . . . 81

### Канцы поэмы

1. Пролёг . . . . . . . . . . . 85
2. Эпілёг . . . . . . . . . . . 96

1964
...4 г.

B00000030774 16